# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 17 чэрвеня 1999 года, чацвер, № 12 (1804)


САЮЗ ЖАНЧЫН БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на стварэнне лепшага сцэнарыя правядзення свята Дня маці (14 кастрычніка).

*Матэрыялы на конкурс прымаюцца да 1 верасня 1999 года.*
*Тэлефон:* ***268-70-05.***

*А Ў ВАС? А Ў НАС!*

## ЭКСКУРСІЯ НА РУДНІК

31 мая ў нас, студэнтаў-геолагаў IV курса (падгрупа літолагаў), адбылася экскурсійная паездка ў горад Салігорск з наведваннем калійнага рудніка; кіраўнік — прафесар В.А. Ярмоленка. Усе арганізацыйныя пытанні былі вырашаны аператыўна — ужо праз паўгадзіны пасля прыезду ў Салігорск мы ў поўнай шахцёрскай амуніцыі былі на самым глыбокім III калійным гарызонце рудніка № 1. На Старобінскім радовішчы гэты руднік быў першым здадзены ў эксплуатацыю ў 1962 годзе, і на ім прадстаўлены ўсе сістэмы распрацоўкі калійных пластоў. Асабліва ўражвае здабыча руды доўгімі ачыстнымі забоямі з абрушэннем страхі, упершыню ў сусветнай практыцы ўкаранёная на Старобінскім радовішчы. Незабыўныя эмоцыі засталіся ад спуску па шахтным ствале ў «чэрава» Зямлі на некалькі сот метраў і ўражанне ад агляду карыснага выкапня ў некранутым, прыродным выглядзе — пад покрывам магутнай таўшчыні вышэйляжачых горных парод. Сапраўды, лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. Спадабаўся нам і горад шахцёраў Салігорск, і зона адпачынку салігарчан бліз Салігорскага вадасховішча, з прыстанямі і яхтамі. Але самае галоўнае, мы ўпэўніліся ў значнасці нашай будучай прафесіі — прафесіі геолага, неабходнай для вырашэння важнейшых задач народнагаспадарчага выкарыстання мінеральных рэсурсаў Беларусі.



*Студэнты-геолагі, IV курс*

*ШТО НОВАГА?*

## ІНІЦЫЯТЫВА, ТВОРЧАСЦЬ, МІЛАСЭРНАСЦЬ

Унутраны змест гэтых слоў спакон веку на Беларусі так ці інакш быў звязаны з імем Жанчыны. Яна натхняла людзей мастацтва на творчасць. А вось ініцыятыўнасць жанчыны заслугоўвае асобнай размовы, бо звязана яна непасрэдна з сучаснымі рэаліямі. Сугучча сацыяльных, эканамічных, духоўных праблем часцяком стрымлівае практычную рэалізацыю грамадскай думкі, раз'ядноўвае таленавітых людзей. Адзінае выйсце, знойдзенае яшчэ нашымі продкамі, — аб'яднанне, талака.

2 чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце пачаў работу Саюз жанчын БДУ. Гэтая арганізацыя заявіла пра сябе як пра незалежную грамадскую няўрадавую, створаную на аснове вольнага аб'яднання жанчын. Як адзначана ў статуце, галоўнай мэтай Саюза з'яўляецца "садзейнічанне ў абароне правоў і законных інтарэсаў жанчын, працуючых у Беларускім дзяржаўным універсітэце, забеспячэнне прыстойнага становішча жанчыны ў грамадстве, павелічэнне яе ролі ў эканамічным, сацыяльным, культурным жыцці". Акрамя таго, Саюз паставіў перад сабою задачы "актыўнага прыцягнення жанчын БДУ да кіравання справамі універсітэта". Дарэчы, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.Б. Аджаеў на арганізацыйным пасяджэнні вобразна падкрэсліў няяўнасць амаль цалкам мужчынскага саставу ў кіраўніцтве і звярнуў увагу на неабходнасць мець гаспадыню ў доме.

Каб скаардынаваць дзейнасць Саюза, ініцыятыўная група выпрацавала тры асноўныя накірункі дзейнасці, зацверджаныя падчас арганізацыйнага сходу: ініцыятыва, творчасць, міласэрнасць. Намеснік старшыні Саюза жанчын Беларусі С.Р. Савіна пазнаёміла прысутных з працай гэтай рэспубліканскай арганізацыі і зрабіла некалькі прапаноў універсітэцкаму калектыву. Найбольш значныя з іх — стварэнне Цэнтра інфармацыйных адукацыйных тэхналогій, Клуба дзелавой жанчыны, правядзенне спецыяльных даследаванняў па вывучэнні ўплыву неспрыяльных фактараў на жыццядзейнасць жанчыны ў сучасным грамадстве.

Другім пунктам павесткі дня арганізацыйнага сходу было зацвярджэнне статута. Асобная ўвага была нададзена абранню Савета Саюза жанчын БДУ. У яго былі ўключаны 19 прадстаўніц факультэтаў універсітэта. Зважаючы на назапашаны вопыт працы, старшынёй Саюза жанчын Савет абраў С.Р. Савіну, дацэнта факультэта філасофскіх і сацыяльных навук. Яе намеснікамі сталі В.П. Саладуха, начальнік Упраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў, і Н. М. Ніжнева, прафесар, загадчык кафедры рамана-германскіх моў.

Стварэнне арганізацыі такога ўзроўню — неабходнасць, але адначасова гэта і магчымасць для прафесійнага і службовага росту ўсіх жанчын БДУ. Дык няхай тыя пажаданні, што прагучалі на пасяджэнні Савета жанчын з вуснаў рэктара Белдзяржуніверсітэта Аляксандра Уладзіслававіча Казуліна, сапраўды здзейсняцца.

*Таццяна ЛУЙГАС*





На здымках: *Выступленне прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Б. Аджаева; Другая справа — старшыня Саюза жанчын БДУ С.Р. Савіна*

*Фота Івана Пупшыновіча*

# ЯК ЛІЦЭЙ ПРАВОДЗІЎ У ВЯЛІКАЕ ЖЫЦЦЁ "КАРАПУЗІКАЎ-97"

Апошні званок... Штосьці асаблівае, у нейкай ступені настальгічнае і слёзна-прабіўное, а ў нейкай ступені радаснае і ўрачыстае звязана ў ліцэістаў з гэтай падзеяй. Кожны з іх аднойчы будзе стаяць тут, каля гэтых бярозак, і слухаць, як шэпт лісця праводзіць іх з дзяцінства ў новае, складанае і цікавае вялікае жыццё... Што гэта значыць? А ўсё! Дзяцінства, як гэта ні сумна ўсведамляць, праходзіць, два гады, праведзеныя ў ліцэі, падыходзяць да шчаслівага фіналу. Тыя, хто калісьці вучыўся пад адным дахам і дзяліў паміж сабой усе тыя маленькія радасці і смутак, якімі запоўнена ліцэйскае жыццё, разлятаюцца хто куды.

Вось і нам, карапузікам 1997 і мацёрым адзінаццацікласнікам 1998, прыйшоў час развітацца з альма-матэр і стаць выпускнікамі 1999. Урачыстасць была прызначана на 10 гадзін раніцы: на гадзіну пазней, чым звычайна пачынаюцца заняткі. Але ўжо ў 9 ліцэісты пачалі падыходзіць з кветкамі і шарыкамі да роднага зялёнага будынка на вул. Маякоўскага.

Трэба сказаць, што апошні званок, як і многія іншыя святы ў ліцэі, мае свае традыцыі, якія вось ужо дзевяць гадоў ашчадна захоўваюцца і памнажаюцца. Ва ўрачыстым слове дырэктар Генадзь Уладзіміравіч Пальчык пажадаў нам, ужо не адзінаццацікласнікам і яшчэ не выпускнікам, паспяхова здаць выпускныя і ўступныя экзамены. За гэтым было ўзнагароджанне самых творчых з тых, для каго звінеў апошні званок. А калі з дзвярэй роднай сталовай дзесяцікласніцы вынеслі сваім старэйшым «калегам» апошняе марожанае дзяцінства, нехта ў шэрагах адзінаццатых класаў нават пусціў слязу.

Як толькі вядучыя лінейкі вымавілі апошнія словы, пастраенне імгненна рассыпалася і ператварылася ў вялікі шумны натоўп — ліцэісты, выкладчыкі, выпускнікі..

А свята ў ліцэі было яшчэ ў самым разгары. Праз якіх-небудзь 15 хвілін на ліцэйскім стадыёне пачаўся футбольны матч паміж зборнай выпускнікоў-99 і зборнай выкладчыкаў. Вопытныя ў гульнях выкладчыкі, не марудзячы ні хвіліны, нацягнулі шорцікі, маечкі і бутсы і пабеглі на поле размінацца. За імі пакрысе пачалі спускацца з горачкі сённяшнія праціўнікі і балельшчыкі, якія імгненна запоўнілі трыбуны і падрыхтаваліся балець за сваіх.

Гульня пачалася па суддзі — выкладчыка фізвыхавання Цімафея Яўгенавіча Андрэева. І адразу стала зразумела, барацьба будзе ўпартай. Атакі выкладчыкаў і выпускнікоў адна за другой, але ніхто не жадаў, і ўжо ў першыя хвіліны гульні нападаючы выкладчыкаў А.В. Варанец выкачаўся ў пыле і навёў «прыгажосць» на сваёй белай маечцы. Гэта не перашкодзіла яму на 17-й хвіліне адкрыць лік — 1:0. Трыбуны ахапіў выбух абурэння, і падбадзёрвальныя крыкі ў адрас выпускнікоў пачалі раздавацца часцей і грамчэй. Але ім было не да таго. Гэты першы гол, як мне здалося, усхваляваў іх, і яны сталі гуляць больш асцярожна, імкнучыся не дапускаць памылак.

Выкладчыкі зноў упэўнена кінуліся ў атаку, змятаючы ўсё на сваім шляху. Трэба аддаць належнае варатару выпускнікоў — ён не аднойчы выратоўваў свае вароты і сваю каманду ад выкладчыка геаграфіі Д.К. Краўцэвіча, які, дарэчы, на апошніх хвілінах першага тайма забіў штрафны. Такім чынам, лік стаў на карысць выкладчыкаў 2:0.

У другім тайме выпускнікі сабраліся з сіламі і гульня пачала набываць больш рэзкі характар — атакі на вароты абедзвюх камандаў сталі больш частымі. У гульню ўступіў Д.М. Зайцаў. Варатару В.Н. Янчэні (выкладчыку фізвыхавання) давялося цяжка — на 40-й хвіліне па пенальці лік стаў 2:1. Балельшчыкі былі ў захапленні.

Надзея, вось што дало новыя сілы выпускнікам, і ніхто не змог прадухіліць гола, які паследаваў адразу пасля пенальці і зраўняў лік. Цяпер у той і другой каманды былі роўныя шанцы на перамогу. А што датычыць бязмежнай радасці балельшчыкаў, то яе складана і апісаць: у паветра паляцелі пінжакі і шалікі, а іх палёт суправаджаўся віскам, свістам, крыкамі і жартамі.

Але за 13 хвілін да канца матча падзеі пайшлі іначай, чым хацелася б выпускнікам і іх балельшчыкам. Адзін з лепшых ігракоў каманды выпускнікоў атрымаў ад суддзі сюрпрыз у выглядзе "чырвонай карткі" і выдаленне з поля. Пасля гэтага гульня выпускнікоў набыла адчайны характар: яны пачалі дапускаць такія элементарныя памылкі, што Д.М. Зайцаву было вельмі лёгка прарвацца да варотаў і забіць гол.

Пасля гэтага многія выпускнікі апусцілі галовы і вырашылі, што прайгралі, бо да канца гульні заставаліся лічаныя хвіліны. А выкладчыкам удалося забіць яшчэ адзін гол, і лік стаў 4:2.

Многім балельшчыкам, і мне ў тым ліку, вельмі хацелася б, каб калі-небудзь зборная выпускнікоў усё ж пахіснула непераможнасць зборнай выкладчыкаў. Можа, гэта зробяць нашы пераемнікі з 10-х класаў?

*Аляксандра КАЗЛОЎСКАЯ*

НАВІНЫ ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ПЕРШЫЯ ВЫПУСКНІКІ-ГЕОЛАГІ

На пачатку чэрвеня на геаграфічным факультэце БДУ адбылася абарона дыпломных праектаў першага выпуску студэнтаў-геолагаў БДУ. Будучых геолагаў рыхтавалі на кафедры дынамічнай геалогіі, якая была створана ў нашым універсітэце пяць гадоў таму.





Дзяржаўная экзаменацыйная камісія ацаніла веды спецыялістаў толькі на добра і выдатна. Некаторыя з іх рэкамендаваны да навучання ў аспірантуры. Прадпрыемствы вытворчага аб'яднання "Беларусьгеалогія" і НДІ геалагічнага профілю папоўняцца айчыннымі спецыялістамі.

На фотаздымках: *загадчык кафедры дынамічнай геалогіі прафесар В.М. Губін; ідзе абарона дыпломнага праекта.*


АБ'ЯВЫ

## Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД

- малодшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі малекулярнай генетыкі бактэрый;
- навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі матэматычнага мадэліравання ў электроніцы — 2.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220050, г. Мінск, Белдзяржуніверсітэт, вул. Бабруйская, 9, навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 406, 407, тэл. 226-47-64.

# СВАБОДЫ НЕ МОЖА НЕ ХАПАЦЬ?

*З узнікненнем універсітэтаў у сярэднія вякі нарадзілася і гэтая, крыху дзіўнаватая, злёгку разумная і добра-такі шумная, суполка – студэнцтва. І адразу ж вызначылася сваім нежаданнем падпарадкоўвацца даўно ўсталяваным правілам, законам, традыцыям і забабонам. Студэнтаў называюць "вольным народам", кажуць пра іх часам хваравітую патрэбу ў свабодзе.*

*Ці адчувае сябе сучасны беларускі студэнт прадстаўніком таго "вольнага народа"? Я вырашыла высветліць гэта, пагутарыўшы з сённяшнімі студэнтамі, і была вельмі здзіўленая: мала хто з іх ставіць перад сабой падобныя пытанні, а многія знаходзяць прычыны, каб вылучыць сябе з "суполкі" студэнцтва, абмежавацца стасункамі падчас лекцый ды іспытаў. Але ўсе згодныя ў адным: свабода – гэта адчуванне, яе не можа не хапаць.*



**— Ці даў статус студэнта якія-небудзь дадатковыя свабоды, якіх не было раней, а можа, пазбавіў іх?**

*Алена* (журфак БДУ):

— Ніколі не задумвалася, дало мне што-небудзь званне студэнткі ці не. Па-першае, я не студэнтка, а жонка. Студэнтка — гэта на другім плане. Сям'я ж свабоду ніколі не забірае, гэта яшчэ адна падтрымка, дапамога. Раней я жыла ў інтэрнаце. Многія скардзяцца, што ён не дае студэнту поўнай свабоды. Я з гэтым не згодная. Нават патрабаванне прыходзіць да 23 гадзін — неабходнае. Студэнт павінен ведаць, што існуе абмежаванне для яго. Потым ён зразумее, што гэта было правільна.

*Інеса* (недзяржаўны жаночы інстытут "ЭНВІЛА"):

— У школе я не магла так свабодна выказаць думку. Не, я ніколі не была надта сціплым, ціхім дзяўчом, але толькі інстытут, новыя сябры дапамаглі мне хутчэй самавызначыцца. Можа, гэта звычайны працэс сталення?

*Вольга* (журфак БДУ):

— Я ведаю, што для многіх студэнтаў — гэта дадатковая свабода ад сям'і, бацькоў, пазбаўленне ад школьнага іміджу. Тое самае я магу сказаць і пра сябе. Але я "платніца", не атрымліваю стыпендыі, таму не адчуваю сябе цалкам студэнткай. Да таго ж, раней я навучалася ў ліцэі, там дастаткова "студэнцкая" атмасфера, таму не магу сказаць, каб у маім жыцці нешта асабліва змянілася.

*Валерыя* (РТУ):

— Студэнцтва не прынесла мне новых сяброў: я адзіная на курсе размаўляю па-беларуску, а гэта вельмі выдзяляе і аддаляе. У сэнсе свабоды "ўлада" (гэта значыць, выкладчыкі і дэканат) нядобра ставяцца да студэнтаў. Не заахвочваецца жаданне самавызначэння. Абавязковая прысутнасць на лекцыях (часам нецікавых і непатрэбных) абмяжоўвае, многія прыходзяць толькі дзеля "галачкі". Але некаторыя ўжо працуюць, што таксама неабходна падтрымліваць і заахвочваць.

**— Чаго не хапае сучаснаму студэнту для поўнай свабоды?**

*Алена:*

— Трэба зняць экзамены, але не прыбраць іх увогуле, як хацелі б некаторыя, а ўвесці тэсты. Каб не вучыць, напружваючыся, тры дні, а ісці на экзамен, маючы падтрымку выкладчыка. Вось гэта будзе свабода, разумная свабода.

*Вольга:*

— Адчуванне свабоды ў кожнага чалавека асабістае. Яно не звязана з нашым светам рэчаў. І яно не заўсёды належыць студэнту.

*Валерыя:*

— Уся сістэма экзаменаў, залікаў не спрые вольнаму. Хаця зараз студэнты сталі больш зацікаўленыя ў навуцы, з'явілася больш аспірантаў. У камп'ютэрнай сферы студэнты могуць нават быць лепш дасведчаныя за выкладчыкаў, а значыць, яны і больш вольныя.

*Інеса:*

— Свабода — гэта адчуванне. Нішто не можа перашкодзіць адчуваць сябе так ці інакш. Свабода альбо ёсць, альбо яе няма.

Такім чынам, свабода для студэнта — найперш маральная, псіхалагічная праблема. Паняцці "палітыка" і "свабода" рэдка стаяць побач. Але ў гэтым не вінаватае нашае грамадства. Памыліцца той, хто назаве сённяшняе студэнцтва моцна палітызаваным: студэнты рэдка размаўляюць пра палітыку.

*Крысціна КУРЧАНКОВА, студэнтка факультэта журналістыкі*

СЛУЖБА 02

# МОЙ ДОМ – МАЯ КРЭПАСЦЬ?

У цяперашні час неабходна быць асабліва пільнымі — вельмі часта рабаўнікам дапамагаюць абрабаваць кватэру самі гаспадары. Так, у адзін з веснавых дзён у адну з кватэр па вуліцы Пуцейнай, дзе пражывае студэнт 3-га курса БДУ, пазванілі ў дзверы. На парозе было двое невядомых, адзін з якіх у камуфляжнай міліцэйскай форме. Паказаўшы пасведчанне, «налётчыкі» выкралі валюту, відэаапаратуру і зніклі.

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікамі УКР ГУУС Мінгарвыканкома сумесна з крымінальным вышукам Маскоўскага РУУС горада Мінска ўстаноўлена, што гэтае злачынства здзейсніў раней судзімы грамадзянін
Асоба другога злачынцы высвятляецца.
Аналагічнае
было здзейснена і ў доме
па вуліцы Грушаўскай.
у дзверы. Гаспадар
у глазок. Двое. Адзін у камуфляжнай форме ў званні прапаршчыка. Нічога не падазраючы, ён адчыніў дзверы. Пад пагрозай пісталета і нажа злачынцы надзелі на гаспадара наручнікі, звязалі скотчам ногі і галаву, выкралі валюту, золата, тэлефон, пасля гэтага зніклі.

Па няведанні альбо па абыякавасці пацярпелыя самі далі злачынцам такую магчымасць. Будзьце больш пільнымі!

*Нэла ШПАК, супрацоўнік Маскоўскага РУУС г. Мінска*

## Віншуем!

Супрацоўнікі і студэнты Белдзяржуніверсітэта віншуюць дэкана падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян БДУ Анатоля Васільевіча Паўлава, які 18 чэрвеня святкуе свой 50-гадовы юбілей. Жадаем імянінніку моцнага здароўя, поспехаў ва ўсіх добрых справах, радасці, шчасця і ўдачы!



# У нашым двары

За апошнія гады дворык універсітэцкага гарадка сапраўды ператварыўся ў мясцовую славутасць. Супрацоўнікі і студэнты ўжо прызвычаіліся да прыгожых і рэдкасных кветак на альпійскай горцы, да добраўпарадкаваных прысадаў і дарожак, да арыгінальных ліхтароў.

Тут можна спакойна пасядзець на лаўцы ў цяньку, схаваўшыся ад спякотнага чэрвеньскага сонца. А калі прыслухацца, то можна пачуць спевы птушак. Прыемна, што тут заўсёды чыста, утульна і дагледжана. Нездарма першыя ў Мінску скульптуры нашым славутым суайчыннікам Францыску Скарыне і Мікалаю Гусоўскаму паявіліся менавіта ва універсітэцкім двары.









# НЕЗАБЫЎНАЕ

**На 22 чэрвеня 1941 года ў мінчан было прызначана вялікае свята — урачыстае адкрыццё Камсамольскага возера. Амаль усё насельніцтва горада сабралося на гэтае свята. Над галавой было летняе чыстае неба, святочна ззяла сонца, прыгарады Мінска танулі ў зяленіне. Тым больш неверагодна прагучала трагічная вестка: вайна!**

Мае бацькі былі медыцынскімі работнікамі. У гэты час яны знаходзіліся на працы: маці дзяжурыла ў дзіцячай кансультацыі, а бацьку выклікалі ў шпіталь на аперацыю. Мы з братам заставаліся дома з хатняй работніцай. Калі па радыё абвясцілі аб пачатку вайны, маці прыбегла дадому, схапіла сумку з дакументамі і новы чырвоны патэфон, хутка апранула нас і сабралася ісці на ўскраіну горада да сваёй сястры. Бацька дапамог нам дабрацца да цёткі на Цнянскі завулак. Памятаю, як ён пасадзіў майго брата сабе на шыю і нёс. Малы ўвесь час плакаў. Потым бацька пайшоў даганяць сваю часць у бок Уручча. Так мы яго бачылі апошні раз.

24 чэрвеня Мінск бамбілі. Наш дом быў разбураны, усе тыя, хто быў у ім, загінулі. Потым пачаліся масіраваныя бамбёжкі, і стала відавочна, што вораг набліжаецца да горада. Насельніцтва рушыла на ўсход: Маскоўская і Магілёўская шаша былі запруджаныя ўцекачамі. Мы адправіліся таксама, але далёка прайсці не змаглі: мне было 5 гадоў, сястры — 4, брату — 3, бабулі — 58. Далёка сысці не атрымалася — фашысцкія дэсантнікі перарэзалі шляхі да адыходу. Мы спыніліся ў вёсцы Цна, дзе нас прытулілі зусім чужыя людзі. Разам зрабілі зямлянку, у якую падчас налётаў збіралася мноства людзей. Харчаваліся першым часам за кошт таго, што цётка ўсе свае рэчы і рэчы мужа мяняла на хлеб і бульбу.

Доўга ў вёсцы жыць не давялося: бабуля захварэла на брушны тыф. Гэта было небяспечна для іншых. Давялося вярнуцца ў горад, дзе мы знайшлі двухпакаёвую кватэру ў драўляным доме, дзе раней жыла яўрэйская сям'я. У гэтым доме апрача нас жылі яшчэ чатыры сям'і такіх самых уцекачоў. Каб ратаваць бабулю, былі патрэбны медыкаменты. Маці ўладкавалася працаваць дзіцячым доктарам.

У паліклініцы яна пазнаёмілася з дактарамі, якія падтрымлівалі сувязь з партызанамі. Колькі разоў маці забіралі сярод начы на "чорным варанку", а мы заставаліся адны і ўсю ноч раўлі. У горадзе была прызначана каменданцкая гадзіна. І хаця ў маці быў "аўсвайс", але і з гэтым пропускам таксама было страшна хадзіць па позніх выкліках.

Пачалі з'яўляцца першыя шыбеніцы. Ладзіліся яўрэйскія пагромы, аблавы на дзяцей, якіх звозілі ў Германію. Турмы і засценкі СД пастаянна былі перапоўнены зняволенымі, якіх без усялякага разбору накіроўвалі ў душагубках у лагер смерці Трасцянец, дзе трупы звальвалі штабялямі, аблівалі бензінам і спальвалі.

З набліжэннем фронту да сталіцы рэспублікі ўзмацніліся дзеянні партызан. Прадчуваючы непазбежнасць свайго паражэння, фашысты рабілі ўсё, каб сцерці Мінск з твару зямлі. Увесь горад быў апаясаны калючым дротам, спецыяльныя каманды гітлераўцаў узрывалі ацалелыя будынкі, вялікія дамы.

3-га ліпеня 1944 года першымі ўвайшлі ў сталіцу савецкія танкісты і аўтаматчыкі. Мінск ляжаў у руінах. Засталася непашкоджанай толькі дзесятая частка жылых дамоў. Былі поўнасцю знішчаны ўсе прадпрыемствы, электрастанцыі, водаправод, каналізацыя, сувязь. Яшчэ доўга пасля вызвалення па ўсім горадзе віселі шыльдачкі "Асцярожна, замініравана!".

Усё перажытае забыць немагчыма...

*С.П. ЕЛЬКІНА*

САКРЭТ ФІРМЫ

# "КАСА ЎЗАЕМАДАПАМОГІ" З РЫНКАВЫМ МЕХАНІЗМАМ

**Які студэнт не карыстаўся хоць раз у жыцці магчымасцю "перахапіць да стыпендыі" грошы ў аднакурсніка ці суседа па інтэрнацкім пакоі? Папулярныя такія сяброўскія пазыкі і ў выкладчыкаў. Але, аказваецца, у свеце вынайдзены больш надзейны і эфектыўны спосаб "стаць багатым".**

Мяркуецца, што ўжо да восені беларусы змогуць стаць не толькі сведкамі, але і ўдзельнікамі эксперыменту па ўкараненні ў краіне асаблівых фінансавых установ, якія аб'ядноўваюць грамадзян на аснове агульных інтарэсаў для аказання фінансавай узаемадапамогі шляхам акумуліравання часова вольных грашовых сродкаў і прадастаўлення крэдытаў.

Папярэднім вынікам паўтарагадовай працы супрацоўнікаў ААН/ПРААН па праекце "Спрыянне стварэнню інстытута крэдытных саюзаў у РБ", які ажыццяўляецца ў рамках сумеснай з урадам Беларусі праграмы "Фармаванне інфраструктуры падтрымкі і развіцця малога прадпрымальніцтва ў РБ", сталі падрыхтоўка і ўзгадненне ў зацікаўленых міністэрствах і Нацыянальным банку РБ праекта ўказа прэзідэнта па стварэнні крэдытных саюзаў малога прадпрымальніцтва. Перададзены на разгляд у міністэрствы і ведамствы і праект дэкрэта па стварэнні і дзейнасці крэдытна-спажывецкіх саюзаў грамадзян.

Па звестках ПРААН, у свеце зараз паспяхова функцыянуюць 36 тысяч крэдытных саюзаў, якія аб'ядноўваюць 90 мільёнаў чалавек. На пачатку 90-х гадоў сістэма крэдытных саюзаў стала адраджацца і ў былых краінах сацлагера. Беларусь, дзе толькі зараз разглядаецца магчымасць існавання своеасаблівых "касаў узаемадапамогі", сістэма якіх грунтуецца на рынечным механізме, апынулася ў гэтым шэрагу на апошнім месцы.

Нацыянальныя асаблівасці крэдытных саюзаў у Беларусі такія, што стаіць пытанне аб падтрымцы не толькі насельніцтва, але і малога прадпрымальніцтва. Таму ў нашай рэспубліцы плануецца стварыць два віды крэдытных саюзаў. Гэта будуць таварыствы ўзаемнага крэдытавання дробнага бізнесу і крэдытныя спажывецкія кааператывы грамадзян.

Як будуць развівацца крэдытныя кааператывы грамадзян (якія змогуць дапамагчы вырашыць становуча фінансавыя праблемы, у тым ліку студэнтаў і выкладчыкаў, без суседскай пазыкі), меркаваць пакуль цяжка. Плануецца, што першыя крэдытныя саюзы грамадзян будуць узнікаць на базе прафсаюзаў. Не трэба толькі блытаць іх з былымі касамі ўзаемадапамогі. Так званыя "чорныя касы" існавалі на прынцыпах дабрачыннасці, якія падчас пераходу да рынкавых умоў аказаліся нядзеяздольнымі. Новыя крэдытныя саюзы — гэта ўзаемадапамога ў захаванні сродкаў і выдзяленні крэдытаў. Вольныя сродкі ўдзельнікаў прыцягваюцца пад працэнты, як у банку. Праўда, працэнты, налічаныя па рахунках, у саюзе будуць вышэй, а працэнтныя стаўкі за прадастаўленыя займы і паслугі — ніжэй, чым у банку. Сакрэт просты: саюзы працуюць толькі для сваіх членаў, займаючыся толькі пазыка-ашчаднымі аперацыямі і не ставячы за мэту атрыманне прыбытку.

Аб'ядноўчай прыкметай для членаў саюза стануць агульныя інтарэсы. Арганізоўвае кааператыў не проста група грамадзян, а члены аднаго прафесіянальнага саюза, адной установы. Гэта і ёсць той самы фактар, які дазваляць мінімізаваць рызыку пры выдачы спажывецкага крэдыту і спрасціць працэдуру яго выдачы. У сусветнай практыцы ў падобных саюзах практыкуецца нават выдача крэдыту пад роспіс.

*Марына АВЕРКІНА*

# ПАДАРОЖЖА ПА СВЯТОЙ ЗЯМЛІ




У гэтым годзе геаграфічная навука адзначае 450-годдзе з дня нараджэння заснавальніка геаграфічных даследаванняў у Вялікім княстве Літоўскім — Мікалая-Крыштафа Радзівіла, які нарадзіўся 2 жніўня 1549 года ў Нясвіжы ў сям'і літоўскага канцлера князя Мікалая Радзівіла па мянушцы Чорны. Княжацкі род Радзівілаў вядомы з XII стагоддзя, яго прадстаўнікі займалі вышэйшыя дзяржаўныя і ваенныя пасады на Русі Літоўскай, затым у Рэчы Паспалітай, а з канца XVIII і на пачатку XX стагоддзя — у Расіі. Радзівілы заўсёды дабаўлялі мянушкі да аднолькавых імёнаў прадстаўнікоў свайго роду, ставячы сябе такім чынам у адзін шэраг з пануючымі ў Еўропе дынастыямі. Мікалай-Крыштаф атрымаў мянушку Сіротка з лёгкай рукі Жыгімонта II Аўгуста, вялікага князя літоўскага (з 1529 года) і караля польскага (з 1548 года).

Выхаванне і адукацыю Мікалай-Крыштаф Сіротка атрымаў грунтоўную. Інакш і быць не магло — бацька, Радзівіл Чорны, адукаваны ва універсітэтах Германіі, шчыры кальвініст, які заснаваў у Нясвіжы друкарню і выдаў знакамітую Брэсцкую (Радзівілаўскую) Біблію, дбаў аб добрым выхаванні і адукацыі сына. Пасля хатняй падрыхтоўкі Сіротка скончыў Лейпцыгскі універсітэт, дзе вывучаў геаграфію і медыцыну, а потым шмат падарожнічаў па Заходняй Еўропе з наведваннем універсітэтаў.

Пасля смерці бацькі Сіротка трапіў у Еўропе пад уплыў вядомага езуіта Пятра Скаргі і ў 1567 годзе перайшоў у каталіцкую веру. Атрымаў у поўную спадчыну Нясвіж. У 1586 годзе, калі горад атрымаў магдэбургскае права і герб, Сіротка адразу ж пачаў у сваім маяраце шырокае будаўніцтва, запрасіўшы для гэтага з Італіі знакамітага архітэктара Дж. Бернардоні. У Нясвіжы былі пабудаваны бенедыктынскі, дамініканскі, бернардынскі і езуіцкі кляштары з касцёламі. Замест драўлянага палаца быў пабудаваны каменны замак — дамінанта палацава-паркавага комплекса, які захаваўся да нашага часу. Прыгажосці сучаснага Нясвіжа з яго шматлікімі архітэктурнымі помнікамі беларускі народ абавязаны, такім чынам, Мікалаю-Крыштафу Радзівілу.

Радзівіл Сіротка падтрымліваў унутраную і знешнюю палітыку Стэфана Баторыя, які стаў у 1576 годзе каралём Рэчы Паспалітай. Напрыканцы Лівонскай вайны (1558-1583) пры асадзе Полацка (1579) Сіротка атрымаў кулявое раненне ў галаву і безвынікова лячыўся на лепшых курортах Германіі ды Італіі. У гэты перыяд у яго з'явілася думка наведаць "дзеля выратавання" святыя месцы Іерусаліма.

У 1581 годзе Радзівіл удзельнічаў у асадзе Пскова арміяй Стэфана Баторыя, а вясной наступнага года пачаў рыхтавацца да падарожжа на ўсходняе Міжземнамор'е, якое працягвалася з 16 верасня 1582 года па 7 ліпеня 1584 года. Вандраваў ён разам са світай — у якасці слуг і спадарожнікаў з ім адправіліся 9 чалавек, у тым ліку лекар Ян Шульц, повар Ерамей Гермек і два езуіты ад Пятра Скаргі. Ужо ў лістападзе 1582 года Радзівіл быў у Венецыі, дзе прабыў даволі доўга — да сярэдзіны красавіка 1583 года. На пачатку чэрвеня марскім шляхам ён дабраўся да Яфы і да канца чэрвеня прыбыў у Іерусалім. У святых месцах Радзівіл правёў толькі два тыдні і ўжо 9 чэрвеня накіраваўся ў Егіпет, дзе прабыў тры месяцы. На зваротным шляху ён спыняўся на многіх астравах (Кіпр, Радос, Крыт і інш.) і толькі ў сакавіку 1584 года выйшаў на еўрапейскі мацярык у Італіі.

Пасля вяртання ў Нясвіж усе свае прыгоды і ўражанні ад падарожжа, адзначаныя ў падарожным дзённіку, Мікалай-Крыштаф апісаў у выглядзе лістоў да прыяцеля (на польскай мове). Гэты рукапіс, аднак, не быў выдадзены адразу, хоць для гэтага князь меў дастаткова часу (ён памёр 28 лютага 1616 г.). Перапрацоўкай свайго дарожнага дзённіка ў кнігу князь заняўся толькі ў 1590 годзе, атрымаўшы спакойную пасаду троцкага ваяводы: Трокі пад Вільняй (цяпер г. Тракай), што размешчаны ў маляўнічым азёрным краі, яшчэ ў XV стагоддзі былі рэзідэнцыяй вялікіх літоўскіх князёў. Маляўнічая прырода і цудоўны сярэднявечны замак на возеры Гальвэ садзейнічалі творчай працы над кнігай, якая была завершана напярэдадні 1595 года.

Сваю кнігу Радзівіл напісаў з мэтай "пашырэння кругагляду сваіх землякоў", але яна выходзіць далёка за межы простага апісання. Пасля яе прачытання ўпэўніваешся ў тым, што аўтар дасканала вывучыў літаратуру Блізкага Усходу — у тэксце кнігі ёсць спасылкі на шэраг літаратурных крыніц; ён цытуе старажытных гісторыкаў (Флавія, Плінія, Тацыта), падарожнікаў XI-XII стагоддзяў, пісьменнікаў XVI стагоддзя. Верагодна, падчас працы над кнігай Радзівіл карыстаўся багатай нясвіжскай бібліятэкай, заснаванай бацькам — Радзівілам Чорным. Падача матэрыялу і крытычнае стаўленне аўтара да першакрыніц даюць усе падставы характарызаваць яго працу як першую спробу навукова-папулярнага апісання геаграфічных аб'ектаў і з'яў ва ўсходнеславянскай літаратуры канца XVI стагоддзя.

Кніга Радзівіла ўпершыню была апублікавана ў Прусіі (1601) на лацінскай мове і перавыдавалася потым у Галандыі (1610, 1614, 1753, 1756). Польскі пераклад з лацінскай, зроблены Андрэем Варгоцкім, неаднакроць публікаваўся ў Кракаве (1607, 1609, 1611, 1617, 1628, 1683, 1745) і Вроцлаве (1847). З лацінскага перакладу былі зроблены два выданні па-нямецку (1603, 1605) і адно па-руску (1787). А рускі пераклад з польскай быў выдадзены ў Маскве ў 1617 годзе і пазней перавыдадзены ў Пецябургу (1879). Арыгінал дзённіка князя Радзівіла па-польску, які захоўваецца ў Варшаве (бібліятэка Красінскіх), апублікаваны параўнальна нядаўна (Варшава, 1962).

Рускія пераклады 1787 і 1879 гадоў цяпер з'яўляюцца вялікай рэдкасцю. Адзін асобнік выдання 1787 года ёсць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, а адзін асобнік выдання 1879 года — у Фундаментальнай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук. Рускі пераклад 1617 года ёсць толькі ў Маскоўскай Сінадальнай бібліятэцы. Аўтар "Агляду рускай духоўнай літаратуры" (1863) справядліва называе гэтую працу Радзівіла цудоўнай, а аўтар прадмовы да выдання 1879 года, сапраўдны член Рускага Геаграфічнага таварыства Пётр Гільтэбрант адзначае, што з усіх выдадзеных старадаўніх "Хаджэнняў у Святую Зямлю" толькі кніга Радзівіла адпавядае патрабаванням навуковай крытыкі. Такая высокая ацэнка "Хаджэння" Радзівіла вельмі важная ў сувязі з тым, што гэта першае ў Беларусі навукова-папулярнае геаграфічнае выданне. Аж да XIX стагоддзя яно было адзіным сапраўдным даведнікам для жыхароў Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі, якія накіроўваліся ў краіны ўсходняга Міжземнамор'я.

Накіроўваючыся "ў Палесціну" пад нагодай наведання святых мясцін, Радзівіл прабыў у Іерусаліме не болей за два тыдні, а рэлігійныя сюжэты ў яго кнізе адыходзяць на задні план. Ён пераважна закранае пытанні рэчаіснасці — прыроднае, геаграфа-этнаграфічнае і гаспадарчае апісанне пабачаных ім краін, заснаванае на асабістых назіраннях "адукаванага чалавека".

Радзівіл прайшоў маршрут у 10 тысяч км праз Аўстрыю, Італію, Далмацыю, Сірыю, Палесціну і Егіпет, а на зваротным шляху — па многіх астравах Міжземнага мора. Ён наведаў Вену, Венецыю, Верону, Рым, Трыпалі, Тыр, Бейрут, Дамаск, Яфу, Іерусалім, Каір і Александрыю. Апісваючы манастыры і культавыя храмы, палацы і руіны, жылыя забудовы, ён распавядае аб іх месцазнаходжанні і матэрыяле, з якога яны створаны, параўноўваючы з еўрапейскімі будынкамі. Дае архітэктурным помнікам эстэтычную ацэнку. Выказвае інтарэс да гісторыі і мастацтва: пры апісанні храма Труны Гасподняй у Іерусаліме ён звяртае ўвагу і на надмагіллі кіраўнікоў крыжаносцаў, падрабязна апісвае Мёртвае мора і Генісарэцкае (Тывeрыядскае) возера, звязанае са многімі гісторыямі з жыцця Ісуса Хрыста, распавядае пра сфінкса і піраміды Егіпта, пра

## ПАДАРОЖЖА МІКАЛАЯ РАДЗІВІЛА (СІРОТКІ) У 1582-1585 гг.




веліч Ніла і Каіра, параўноўваючы іх з Дунаем і гарадамі Еўропы, падрабязна апісвае сажалку Вірсавіі — жонкі цара Давіда, грабніцы і забальзаміраваныя трупы — муміі, інтэр'еры і мазаікі культавых збудаванняў, пахаванне Цыцэрона. Радзівіл падае яскравае апісанне Адрыятычнага, Эгейскага і Міжземнага мораў з іх шматлікімі астравамі. Кніга поўніцца маляўнічымі апісаннямі навакольнай прыроды ў розных краінах. Апісваючы экзатычную флору і фауну ўсходняга Міжземнамор'я, аўтар падрабязна распавядае пра невядомы славянам жывёльны свет: пра кракадзіла, бегемота і леапарда, пра страусаў і папугаяў, хамелеона і г.д., параўноўвае фауну і флору з айчынным жывёльным і раслінным светам. Падрабязна апісвае народныя звычаі, узаемаадносіны між асобнымі народамі (туркамі, арабамі, неграмі), з абурэннем кажа аб рынку рабоў. Як знаўца медыцыны асвятляе пытанні аховы здароўя, у прыватнасці пры апісанні разнастайных эпідэмій. Аўтар не абмінае ўвагай пытанні дзяржаўнага ладу і гаспадарчай дзейнасці. Адзначае важную ролю разліваў Ніла для ўраджайнасці глебы Егіпта. Ён распавядае пра шаўкаводства і бавоўнаводства, вырошчванне фруктовых культур (вінаград, лімоны, апельсіны), выпарванне солі з марской вады на Кіпры, гандаль паміж асобнымі краінамі.

Кніга Радзівіла была штуршком да актывізацыі вандровак і выдання геаграфічных твораў у ВКЛ: пасля Сіроткі на ўсходнім Міжземнамор'і пабывалі Ян-Баптыст Сапега (1613), Ян Бялкоўскі (1618), Мялецій Сматрыцкі (1623) і інш.

У 1596 годзе князь Мікалай-Крыштаф Радзівіл Сіротка выступаў у Брэсце ад імя караля Рэчы Паспалітай з патрабаваннем аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў ва уніяцкую, а з 1604 года стаў віленскім ваяводам і поўнасцю прысвяціў сябе дзяржаўнай дзейнасці.

У сваё апошняе падарожжа з Нясвіжскага палаца ў фамільны склеп езуіцкага касцёла князь адправіўся апранутым у просты плашч пілігрыма. На барэльефе надмагілля паказаны пілігрым з посахам у руцэ і шыракаполым капелюшом за спінай. Пад барэльефам надпіс-эпітафія па-лацінску: "Перад абліччам смерці кожны чалавек не рыцар, а толькі пілігрым". Такой была апошняя воля князя, выхаванага Польшчай, але народжанага на зямлі Беларусі.

*В.А. ЯРМОЛЕНКА,*
*доктар геаграфічных навук*

ФЕСТЫВАЛІ

## ТАВАРЫШ, ВЕР...

Традыцыйна ў апошнія веснавыя дні на маляўнічым беразе Іслачы недалёка ад Ракава праходзіў VIII адкрыты гарадскі мастацка-спартыўны фестываль.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі 19 каманд раёнаў, арганізацый і прадпрыемстваў Мінска. У гэтым годзе фестываль праходзіў пад дэвізам "Таварыш, вер..." і быў прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння А.С. Пушкіна. У праграме фестывалю былі конкурс патрыятычнай песні, знаёмства з удзельнікамі, якія прадстаўлялі свае візітоўкі, конкурс "Міс фестываль", спартыўныя мерапрыемствы. Безумоўна, не абышлося без дыскатэкі, песень ля вогнішча і сустрэчы світанку.

*Аляксандр ЛАБКОЎ*

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ГОСЦІ З УСЯГО СВЕТУ

З 27 мая па 4 чэрвеня гэтага года факультэт міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта наведала дэлегацыя Інстытута Усходняй Еўропы і Сярэдняй Азіі (КНР) у складзе прафесара Лі Юньхуа і старэйшага навуковага супрацоўніка Лі Сіньханя. Падчас візіту дэлегацыі адбыліся сустрэчы з прарэктарам па эканоміцы і камерцыйных пытаннях БДУ С.А. Векшам, дэканам факультэта міжнародных адносін БДУ прафесарам А.В. Шарапам, студэнтамі факультэта міжнародных адносін, супрацоўнікамі кафедры ўсходніх моў. Прайшлі перамовы аб супрацоўніцтве.

* * *

Напрыканцы мая гэтага года юрыдычны факультэт нашага універсітэта прымаў гасцей з універсітэта Эрланген-Нюрнберг (Германія). Візіт адбыўся ў межах праграмы "Тэмпус". Госці знаёміліся з гаспадарчым правам у БДУ. Прайшлі перамовы з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.Б. Аджаевым, кіраўніцтвам юрыдычнага факультэта аб наладжванні супрацоўніцтва паміж універсітэтамі.

## МАСКІ З ВЯСНЫ ДА ЗІМЫ

Прымяняючы маскі, трэба добра ведаць тып сваёй скуры і яе ўласцівасці. Перад першым накладаннем маскі трэба зрабіць "спробу на адчувальнасць", у іншым выпадку нават ягадная кашыца з суніцаў можа выклікаць вельмі кепскія з'явы ў людзей, адчувальных да яе.

Перш чым накладаць маску, трэба вельмі старанна вымыць твар, папярэдне паэбавіўшы яго рэшткаў пудры, губной памады і пылу. Спярша памыйцеся да пояса ў цёплай вадзе туалетным мылам, абсохніце, а потым старанна пачысціце твар і шыю ватным тампонам, змочаным у ласьёне ці вадкім крэме. Валасы зачашыце назад, а потым аддзяліце іх ад ілба павязкай, зробленай з шырокага эластычнага бінта. Вакол вачэй уватрыце кончыкамі пальцаў невялікую колькасць пажыўнага крэму.

Трэба паклапаціцца, каб на той час, калі вы будзеце займацца сваёй знешнасцю, у вас было прынамсі паўтары гадзіны поўнага спакою. Поўнае расслабленне, усведамленне таго, што на вас ніхто не глядзіць і не смяецца з вашага запэцканага маскай твару, кароткі сон падчас маскі — гарантыя таго, што яна прынясе вам карысць.

Сакавітыя, добра вымытыя, нечарвівыя і вельмі свежыя плады пратрыце праз сіта. Калі яны цвёрдыя, як, напрыклад, гуркі ці яблыкі, то іх трэба надраць на тарцы, а атрыманую кашыцу перакладзіце ў міску.

З маскай на твары і шыі трэба спакойна ляжаць 20-30 хвілін. Ні ў якім разе не курыце! Акно ў пакоі павінна быць адчынена. Праз паўгадзіны здыміце кашыцу тампонамі з лігніну, а потым вымыйце твар цёплай вадой. Асцярожна асушыўшы скуру, уватрыце каля вачэй пажыўны крэм. Бліжэйшыя дзве-тры гадзіны, калі гэта магчыма, старайцеся не пудрыць твар і не накладаць грым, каб скура магла добра адпачыць.

## ДЛЯ КОЖНАГА ТВАРУ СВАЯ МАСКА

Агульнае ўздзеянне на скуру пладоў, якія ўжываюцца для масак, такое:

абрыкосы супакойваюць скуру;

баклажаны і кабачкі ўвільгатняюць сухую запаленую скуру;

бананы ўвільгатняюць, разгладжваюць і змякчаюць;

брусніцы і чарніцы звужаюць поры і аздараўляюць;

персікі разгладжваюць і змякчаюць;

вінаград увільгатняе і размякчае;

клубніцы і маліны ўвільгатняюць і аздараўляюць;

лімон вельмі добра звужае поры (у лімонны сок заўжды дадаецца сок іншага плода, бо ён дзейнічае вельмі моцна);

парэчкі розных гатункаў звужаюць поры і аздараўляюць скуру (гэтак жа сама, як вішня).

І калі ў вас нармальная скура, якая не прыносіць ніякіх клопатаў і не патрабуе спецыяльнага догляду, то вы можаце карыстацца кожным з названых пладоў. Трэба толькі быць асцярожнай з лімонным сокам, бо ён можа выклікаць раздражненне.

А вось рэцэпты масак, якія прымяняюцца для пазбаўлення разнастайных недахопаў скуры.

**Гурковая маска** аздараўляе скуру, разгладжвае яе, звужае расшыраныя поры, беліць, рэкамендуецца для скуры стомленай і звялай, якая мае схільнасць да себарэі, з пашыранымі порамі пасля вугроў.

**Карацінавая маска**, ці, інакш кажучы, маркоўная, рэкамендуецца пры тлустай, пакрытай вуграмі, бляклай і звялай скуры.

**Маркоўна-яблычная** маска, апрача ўсіх станоўчых якасцей, названых вышэй, мае яшчэ адну, асабліва каштоўную ўзімку, — увільгатняе скуру.

**Бананавая маска** рэкамендуецца ўвосень, калі скура празмерна высахла ад летняга сонца, ці ўзімку, калі скура кепска трывае сухое паветра ў памяшканнях з цэнтральным ацяпленнем. Гэтая маска ўжываецца таксама ў якасці "хуткай дапамогі прыгажосці" перад нечаканай сустрэчай альбо візітам.

**Памідорная маска** прымяняецца пры тлустай скуры зямлістага колеру з буйнымі порамі.

**Маска з зялёнага гарошку** разгладжвае і асвяжае скуру, а тлустай скуры надае матавасць.

**Маска з парэчак** звужае поры і пераважна рэкамендуецца пры тлустай скуры.



**Маска з маслёнкі** ахаладжае, супакойвае і разгладжвае скуру.

Імгненная **яйкава-мядовая маска** асвяжае скуру.

Цудоўная **вітамінная маска** ўвільгатняе скуру, разгладжвае зморшчыны і прадухіляе іх з'яўленне.

**Маска з адной вялізнай бульбіны**, зваранай у невялікай колькасці малака, імгненна здымае сляды стомленасці на твары і разгладжвае зморшчыны.

## АБ АДПАЧЫНКУ

Калі на працягу года вы працуеце седзячы або стоячы, выконваеце адну і тую ж аперацыю, можна меркаваць, што вас прыгнятае манатоннасць і кіслароднае галаданне. Каб перакanaцца ў гэтым, дастаткова зрабіць падлік хвіліннай вентыляцыі лёгкіх: чалавек, які працуе седзячы, робіць 16 удыхаў за хвіліну, штораз уводзячы ў арганізм 1/2 літра паветра, г.зн. у суме 8 літраў. У чалавека, які рухаецца, пры кожным удыху лёгкія атрымліваюць 1 літр паветра, г.зн. каля 16 літраў за хвіліну. Значыць, сядзячая праца выклікае кіслароднае галаданне тканак і мозга. А кары нашага мозга вельмі патрэбны кісларод! Недахоп яго прыводзіць да санлівасці, няўважлівасці. Таму так важна, каб людзі, якія працуюць па некалькі гадзін за пісьмовым сталом ці ў бібліятэцы, падчас адпачынку хадзілі, рухаліся.

Стан нерухомасці ні для каго, мусіць, не з'яўляецца карысным. Нават для людзей фізічнай працы. Але нельга занадта актыўна брацца за ўзнаўленне кіслароду ў арганізме шляхам доўгіх пераходаў, за ліквідацыю жывоціка пры дапамозе бегу ўздоўж пляжу, за стварэнне фігуры на валейбольнай пляцоўцы. Залішняя рухомасць у першы тыдзень адпачынку можа быць шкоднай. У першыя дні арганізм павінен акліматызавацца і прызвычаіцца да іншага рэжыму харчавання, іншага рытму дня.

Усім, хто хоча вярнуцца з адпачынку з папраўленым здароўем, варта ведаць адну простую параду: пастарайцеся вылучыць час для выканання ўсіх гігіенічных прадпісанняў, якія вы не спраўляліся выконваць на працягу года. Пастарайцеся пазбавіцца ад антыгігіенічных і шкодных звычак.

Ці варта дзяліць адпачынак? Памятайце, што ў кожнай частцы падзеленага, напрыклад, на дэкады адпачынку ёсць толькі тры дні паўнацэннага спакою. Астатні час прыпадае на адаптацыю.

Ці варта з'язджаць? На гэтае пытанне адказ мусіць быць станоўчым. Не кожная фізіяномія з ліку асоб вакол нас і не кожная лесвічная пляцоўка, па якой мы штораніцы ідзём па хлеб, выклікаюць у нас працэсы тармажэння, а яны, як сцвярджаюць дактары, неабходны для рэгенерацыі нервовай сістэмы і для аслаблення напружання.


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана да друку ў 12.00*

*17 чэрвеня*

*Зак. 434.*

*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка П. Крышаловіча*